*Л.Я. Клімуць*

# АФІЦЫЙНЫЯ СВЯТКАВАННІ Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ САРМАТЫЗМУ

Сармацкая ідэалогія па сваёй сутнасці прадугледжвае публічнае яе існаванне і выкарыстанне. Ідэі высокага паходжання, своеасаблівы кодэкс паводзінаў і ўчынкаў шляхціца-сармата асаблівае значэнне і сэнс



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

набываюць менавіта на фоне іншых слаёў грамадства і ў параўнанні з культурай суседніх краін.

Краевугольным камнем сарматызму было тое, што паходжапне шляхты ад сарматаў давала ёй права на выключнае становішча ў грамадстве і права кіравання дзяржавай. Магчыма, менавіта таму ў XVI – XVIII стст. у Рэчы Паспалітай у цэлым і ў ВКЛ у прыватнасці фактычна ўсё жыццё шляхціца, асабліва калі гэта быў прадстаўнік багатага і ўплывовага роду, было публічным, адкрытым вачам назіральнікаў.

На фоне сармацкай ідэалогіі жыццё вышэйшых слаёў набывае асаблівую пышнасць і ўрачыстасць. Аб'ектам тэатралізацыі і публічнай справай становіцца кожны момант жыцця чалавека, пачынаючы ад яго нараджэння і заканчваючы смерцю. Кожная падзея суправаджалася ўрачыстай імпрэзай, якая не проста дэманстравала раскошу і багацце сям'і, а мела дакладна вызначаную сімволіку і праграму.

Раскошаю і складанасцю вызначаліся афіцыйныя мерапрыемствы, так ці інакш звязаныя з каралеўскім дваром. Аднак на тэрыторыях Рэчы Паспалітай, і асабліва гэта справядліва для тэрыторыі ВКЛ, падзеі, якія адбываліся пры дварах буйных магнатаў, па сваёй ідэйнай напоўненасці і па багаццю правядзення і афармлення часцей за ўсё пераўзыходзілі каралеўскія. Тут мы бачым істотнае для сармацкай ідэалогіі ўстанаўленне аб роўнасці усіх прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя, нягледзячы на рангі, у тым ліку і каралеўскае званне.

Падставаю для ўрачыстасцяў пры двары князя Іераніма Фларыяна Радзівіла стаў сон аб тым, што ён стаў каралём. 20 красавіка 1749 года ў час падарожжа варажбітка прадказала яму, што ён стане каролём Рэчы Паспалітай [3, с. 28]. Гэта прадказанне стала ідэяй-фікс князя. З гэтага моманту ўсё жыццё князя было накіравана на сцвярджэнне свайго будучага каралеўскага звання. Са сваёй рэзідэнцыі ён марыў утварыць каралеўскі палац, а само мястэчка Белае перабудаваць на рэгулярны план, прычым прадугледжваліся нават корчмы-аўстэрыі для прыезджых магнатаў [3, с. 30]. Усе гэтыя задумы добра адпавядаюць тагачаснаму разуменню шляхецкай выключнасці.

Вышэйпрыведзены прыклад дае магчымасць убачыць, што нават ўяўныя падзеі натхнялі магнатаў на публічныя выступленні таго ці іншага мастацкага і прапагандысцкага кшталту. У перыяд Рэнесансу і барока адбывалася мноства ўрачыстасцяў, прысвечаных розным нагодам. Ва ўсіх гэтых прадстаўленнях была адна асноўная прычына, а менавіта жаданне праславіць чалавека і яго ўчынкі. У той жа час магнацкія ўрачыстасці нярэдка набывалі больш шырокае значэнне. Калі каралеўскія трыумфы праслаўлялі не столькі чалавека, колькі кара-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

леўскі статус, то магнацкія падкрэслівалі ролю асобы, але – асобы, якая насіла пэўнае фамільнае імя. У вачах сармацкага грамадства сярод асноўных каштоўнасцей адной з важнейшых з'яўляецца аддаласаць сям'і ці, што будзе больш правільным, роду. Гэтыя цырымоніі планаваліся такім чынам, што персанальная, грамадзянская і сацыяльная рэпрэзентацыі аб'ядноўваліся ў іх так, што ўжо нагадвалі шарады са схаваным значэннем.

Для свайго вяселля ў 1583 годзе Ян Замойскі загадаў набудаваць спецыяльны павільён на Вавелі, які павінен быў служыць месцам прыёму караля і каралевы. У час абмену падарункамі, як гэтага патрабаваў звычай, Замойскі паднёс каралеве Ганне келіх, з якога ён піў за здароўе караля ў час аблогі Пскова. Цырымонія, якая суправаджалася ўзяццем шлюбу, вызначалася пышнасцю і пампезнасцю нават на тагачасных густах. Ва ўсёй імпрэзе асабліва ўражвае тое, што сама падзея, дзеля якой сабраліся госці, фактычна адышла на другі план.

Пышнасцю адзначаўся трыумф 1583 года ў гонар перамогі над Масквой, у якім удзельнічалі князі Слуцкія. Тут таксама былі выкарыстаны ўсе тыя падыходы, якія характарызавалі ўрачыстасці XVI ст., у прыватнасці для ваенных трыумфаў абавязковай была прысутнасць палону, багацце ўзбраення, раскоша і разнастайнасць адзення [2, с. 22].

Усе вышэйапісаныя прадстаўленні былі незабыўнымі ў тым, што, па-першае, яны ўвекавечвалі імя галоўнага героя, і, па-другое, яны вызначалі важнасць яго становішча ў любой сферы грамадскага жыцця. У супрацьлегласць перыяду барока сармацкія ідэі ў канцы XVI ст. нават у публічных урачыстасцях заставаліся прыхаванымі. Яны складалі сэнсавую аснову, якую ўсе разумелі, і заставаліся хутчэй фактарам унутранай шляхецкай самасвядомасці.

Эпоха барока мяняе прыярытэты людзей. Менавіта ў эпоху барока сарматызм дасягае піку свайго развіцця, яго ўплывы яскрава відавочны ва ўсіх праявах матэрыяльнага і культурнага жыцця, і ў гэты ж час сарматызм як ідэалогія, набыўшы вызначаную форму, застывае ў ёй і накладвае свае жорсткія рамкі на сацыяльнае і культурнае жыццё краіны. У XVII – першай палове XVIII ст. публічныя праявы сарматызму становяцца больш выразнымі.

Пышнасцю ў XVIII ст. вызначаюцца як святочныя, так і жалобныя ўрачыстасці. У сваім "Дыярыюшу" князь Міхал Казімір Радзівіл апісвае пахаванне свайго бацькі, якое адбывалася на працягу дзевяці дзён у ліпені 1720 г. [1]

Пышнасць падобных цырымоній – неад'емная частка культуры барока і сармацкага ўспрыняцця жыцця і смерці. Лічылася, што нашчадкі сарматаў займалі высокае сацыяльнае становішча па праву свайго па-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ходжання, і таму яны дэманстравалі свой высокі ранг усімі даступнымі сродкамі, асабліва ў XVII – першай палове XVIII ст. У пахаваннях нават жалоба станавілася публічным актам.

Такім чынам, кожную публічную дзею пранізвае ідэя аб тым, што канкрэтны шляхецкі род адыгрывае найважнейшую ролю ў самім функцыянаванні грамадства.

## ЛІТАРАТУРА


1. Дыярыюш князя Міхала Казіміра Радзівіла, ваяводы Віленскага, гетмана вялікага ВКЛ // Спадчына. – 1994 – № 4 – 6.
2. Chodycski, A. R. Zbroje kolcze z gdacskiego dworu Artura. Z tradycji turniejowych w Polsce. – Malbork, 1994.
3. Kowalczyk, J. Hieronima Floriana Radziwiiia stosunek do sztuki I artystyw // Kultura artystyczna Wielkiego Ksikstwa Litewskiego w epoce baroku. Pod red. J. Kowalczyka. – Warszawa, 1995.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. Кулешова